Дзяржаўная ўстанова культуры
"Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна"
*Цэнтральная раённая бібліятэка*

*Серыя «Героі Савецкага Саюза – вызваліцелі Асіповіцкага раёна»*

# У ПАМЯЦІ НАШАЙ ГЕРОІ ЖЫВЫЯ



## БАГДАНАЎ Анатоль Сяргеявіч

# БАГДАНАЎ
# Анатоль Сяргеевіч

(15.12.1922 -19.12.1954)

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



Нарадзіўся 15 снежня 1922 года ў горадзе Коканд цяпер Ферганскай вобласці (Рэспубліка Узбекістан) у сям'і вайскоўца. Яго дзіцячыя гады прайшлі ў Алма-Аце і Акцюбінску. З 1935 года жыў у Іркуцку ў інтэрнаце для дзяцей пагранічнікаў і вучыўся ў школе № 11. У 1940 годзе скончыў 10 класаў і паступіў у Барысаглебскую ваенную авіяцыйную школу лётчыкаў імя В.П.Чкалава, якую скончыў у 1941 годзе.

З 1941 па 1943 год - лётчык 1-га асобнага вучэбна-трэніровачнага авіяцыйнага палка ў Прыволжскай ваеннай акрузе.У дзеючай арміі - са жніўня 1943 года. Ваяваў на Цэнтральным, Беларускім і 1-м Беларускім франтах. Падтрымліваў штурмавымі ўдарамі наземныя войскі пры правядзенні найважнейшых франтавых

і стратэгічных наступальных аперацый у ходзе вызвалення Украіны, Беларусі, Польшчы, у бітвах на тэрыторыі Германіі. Удзельнічаў у баях за Познань, Варшаву, Берлін.У складзе 16-й паветранай арміі ўдзельнічаў на Цэнтральным фронце ў Чарнігаўска-Прыпяцкай наступальнай аперацыі (26 жніўня - 30 верасня 1943 года), за баявыя поспехі ў якой 2-я гвардзейская штурмавая авіяцыйная дывізія атрымала найменне Чарнігаўскай.

На Беларускім фронце ўдзельнічаў у Калінкавіцка-Мазырскай, Рагачоўска-Жлобінскай наступальных аперацыях. З 24 чэрвеня па 7 жніўня 1944 года прымаў удзел у Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі “Баграціён”.У баях за вызваленне Жлобіна, Асіповіч, Калінкавіч, Мазыра, Бабруйска адважны лётчык рабіў па 3-4 вылеты ў дзень.

Да 6 лютага 1945 года здзейсніў на штурмавіку Іл-2116 паспяховых баявых вылетаў па нанясенню бамбардзіровачна-штурмавых удараў па войскам і баявой тэхніцы, стратэгічных ваенных аб’ектах, ўмацаваннях на пярэднім краі абароны праціўніка. Знішчыў 7 танкаў, 50 аўтамашын, паравоз, 10 вагонаў, 15 палявых і зенітных гармат ворага.

У 1945 годзе прымаў удзел у Варшаўска-Познанскай,Усходне Памеранскай, Берлінскай наступальных аперацыях.

**Усяго за гады вайны А.С.Багданаў здзейсніў 129 баявых вылетаў. Апошнія з іх выканаў, громячы войскі праціўніка ў ваколіцах Берліна і ў самым Берліне.**

**За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнам Леніна, 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступені, медалямі.**

**Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 мая 1946 года за мужнасць і гераізм, праяўленыя пры нанясенні штурмавых udaraў па ворагу, Багданаву Анатолю Сяргеевічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медалі “Залатая Зорка”.**

**Пасля вайны працягваў службу ў Ваенна-Паветраных Сілах. Быў камандзірам звяна і начальнікам паветрана-стралковай службы авіяпалка ў Групе савецкіх войскаў у Германіі, Прыкарпацкім і Забайкальскім ваенных акругах.**

**У 1950 годзе А.С.Багданаву было прысвоена воінскае званне капітана. У 1952 годзе скончыў Ліпецкія вышэйшыя афіцэрскія лётна-тактычныя курсы ўдасканалення. Быў начальнікам паветрана-стралковай службы палка і намеснікам начальніка штаба авіяпалка па разведцы і аэрафотаслужбе ў Прыбалтыйскай ваеннай акрузе.**

**Трагічна загінуў 19 снежня 1954 года ў горадзе Кедайняй (цяпер Каўнаскі павет, Літва). Пахаваны ў Маскве на Прэабражэнскіх могілках.**




*Помнік Герою на Прэабражэнскіх могілках у Маскве.*

**Імя Героя носіць завулак у Іркуцку, на будынку школы №11, дзе ён вучыўся, устаноўлена мемарыяльная дошка. Помнік Герою ёсць таксама на “Алеі Герояў” у г.Асіповічы Магілёўскай вобласці.**

# ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ


НАГРАДНОЙ ЛИСТ

Мужны лётчык Анатоль Багданаў першае сваё баявое хрышчэнне атрымаў у бітвах пад Сеўскам 26 жніўня 1943 года. З тых часоў ён зрабіў 116 паспяховых баявых вылетаў на самалёце Іл-2, паказваючы ў баях з нямецкімі захопнікамі адвагу і гераізм. Неаднаразова варожыя цэлі бамбіў і штурмаваў пад моцным агнём зенітак. Падвяргаючыся нападам з боку знішчальнай варожай авіяцыі, заўсёды адбіваў іх атакі і выходзіў з бою пераможцам. Па няпоўных дадзеных, за час баявой дзейнасці паветраным байцом А.Багданавым знішчана і выведзена са строю на полі бою 7 танкаў, 50 аўтамашын, 1 паравоз, 10 чыгуначных вагонаў, 15 зенітных і палявых гармат, 10 павозак з ваеннымі грузамі, узвод гітлераўцаў.

Асабліва гвардзеец Багданаў вызначыўся і вырас з радавога пілота-сяржанта ў камандзіра звяна, старшага лейтэнанта, у баях за Савецкую Беларусь, на зямлі якой пахаваны дзясяткі салдат і афіцэраў праціўніка і шмат яго тэхнікі.

15 снежня 1943 года пры выкананні баявога задання ў раёне Бродкі на самалёт Багданава напалі тры ФВ-190 і абрынулі на Іл свой агонь. У выніку нападу самалёт Багданава атрымаў моцныя пашкоджанні і амаль не паддаваўся кіраванню. Сам лётчык быў паранены ў галаву і, абліваючыся крывёю, губляў сілы. Да сваёй тэрыторыі заставалася трохі, і адважны лётчык, коштам вялікіх намаганняў ўсё ж перацягнуў лінію фронту і пасадзіў свой самалёт на адным з нашых аэрадромаў, тым самым выратаваў не толькі машыну, але і жыццё экіпажа.

13 студзеня 1944 годалётчык Багданаў у групе з 6- ці Іл-2 знішчаў варожы чыгуначны эшалон на раз’ездзе Клінск - Рудня. Пры падыходзе да цэлі праціўнік адкрыў па групе зенітны агонь вялікай сілы. Багданаў, упэўнена ведучы свой самалёт, стрымана і па-майстэрску здзейсніў супраць зенітны манеўр. Раптам зоркае вока лётчыка заўважыла варожую зенітку, якая вяла па ім агонь, знаходзячыся ў гаі ля чыгуначнай станцыі. Ён смела накіраваў свае гарматы на зенітку і хутка, расправіўшыся з ёй, стаў атакаваць эшалон. Тры вагоны з боепрыпасамі запалалі ў выніку прамога пападання бомбаў, скінутых дасведчаным лётчыкам-штурмавіком. На пуцях валяліся трупы гітлераўцаў. Не ведаючы страху і стомленнасці ў баях, Анатоль Багданаў заваяваў павагу да сябе і

славу штурмавіка. Сваімі ўмелымі дзеяннямі ён не раз садзейнічае наземным часцям і пракладае ім шлях на захад.

Так было і 15 лютага 1944 года, калі Анатоль ішоў за вядучым ў групе з 7-міІл-2. Задача, пастаўленая камандаваннем, была адказнай, і яе невыкананне пагражала адыходам нашых войскаў у раёне горада Жлобін. Вораг стараўся перашкодзіць дзеянням нашых паветраных сіл, абстрэльваючы іх сваім агнём і выклікаючы на дапамогу знішчальнікі. Прамым пападаннем зенітнага снарада быў выведзены са строю самалёт вядучага. Багданаў, прыняўшы рашэнне, даў каманду “За мной!”і рынуўся на ворага. Заданне было выканана. Немцы панеслі вялікія страты і больш атак не аднаўлялі.

З гэтых часоў Багданаву даручаюцца больш складаныя заданні ўжо як вядучаму пар і груп. Ён таксама становіцца выдатным разведчыкам і “паляўнічым”. Шмат разоў лётаў у тыл ворага на разведку тэхнікі і жывой сілы, дастаўляючы камандаванню каштоўныя звесткі і адначасоваабстрэльваючы ворага. 29 чэрвеня 1944 года Багданаў у пары з іншым лётчыкам вылецеў на разведку гітлераўскіх войскаўу раён Бабруйск - Асіповічы. Ужо надышоў вечар, калі пара смелых разведчыкаў падышла да мэты. З паўночнай ускраіны лесу, у якім заселі немцы, сталі біць

зеніткі, імкнучыся не дапусціць Ілы да вузла шашэйных дарог. Багданаў зрабіў заход і падавіў зенітны агонь. Даляцеўшы да зададзенай мэты, лётчыкі ўбачылі вялікую колькасць аўтамашын. З ходу Багданаў абрынуўся на аўтамашыны, а затымзнішчаўіхгарматна-кулямётнымагнём.

У дні наступальных баёў савецкіх войскаў і канчатковага разгрому нямецкіх захопнікаў, пачынаючы з 15 студзеня 1945 года, Багданаў зрабіў 20 баявых вылетаў. 16 студзеня 1945 года, нягледзячы на дрэннае надвор’е, Багданаў выконваў баявое заданне ў раёне Варшавы. Ён знізіўся да 50 метраў, каб лепш разглядзець рух аўтакалоны, і пачаў абстрэл аўтамашын і груп немцаў, паралізаваўшы іх рух. У раёне Скернавіцэ самалёт Багданава быў падбіты зенітным снарадам. Лётчык, бачачы пад сабой варожыя аўтамашыны, скінуў на іх свае бомбы і адышоў на сваю тэрыторыю. У гэтым вылеце ён знішчыў 4 аўтамашыны і 5 - 10 салдат праціўніка.

17 студзеня 1945 года гвардзеец Багданаў вылецеў на разведку – “паляванне” у пары са сваім баявым таварышам. Смелыя разведчыкі глыбока праніклі ў тыл ворага і, маскіруючыся цемнатой, на брыючым палёце выскачылі на ўскраіне горада Сохачаў. Нямецкія зеніткі не паспелі адкрыць агонь, калі Багданаў ударыў з гармат па варожых эшалонах і схаваўся, разведваючы зададзены раён.

А яшчэ лётчык абстраляў тылавыя абозы і асобныя аўтамашыны. Толькі калі закончыўся боекамплект, воін вярнуўся на свой аэрадром, маючы каштоўныя разведданыя аб ворагу.

29 студзеня 1945 года Анатоль Багданаў ўдзельнічаў у знішчэнні немцаў, акружаных ў горадзе Познань. За дзень ён зрабіў 3 баявыя вылеты, паказваючы майстэрства штурмавога і бомбавага ўдару. За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецкімі захопнікамі, за 116 выкананых паспяховых баявых вылетаў і праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм Анатолю Багданаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.



# ЛІТАРАТУРА


1. Богданов Анатолий Сергеевич – Герой Советского Союза, участвовал в освобождении г.Осиповичи // Герои Советского Союза : краткий биограф.словарь. В 2т. Т.1. -- Мн., 1987. -- С.173.
2. Богданов А.С. // Навечно в сердце народном. -- Мн., 1984. -- С.60--61
3. Богданов Анатолий Сергеевич [Электронный ресурс] /Помни Про : электронный мемориал. – М., 2011-2014. – Режим доступа :http://www.pomnipro.ru/memorypage26650/biography
4. Богданов Анатолий Сергеевич[Электронный ресурс] / Герои страны : интернет проект. – Минск, 2000-2013. – Режим доступа :http://www.warheroes.ru
5. Богданов Анатолий Васильевич/ Электронный банк документов «Подвиг народа в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг. – Режим доступа :http://www.podvignaroda.mil.ru